Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»*

29 чэрвеня 2018 года, № 11 (2199)

## У нумары:

**СУСВЕТНЫЯ РЭЙТЫНГІ І ДЫНАМІКА Ў ІХ БДУ**
Гутарка з намеснікам старшыні савета па павышэнні рэйтынгу БДУ ў сусветнай навукова-адукацыйнай прасторы Аляксеем ТОЛСЦІКАМ
*Стар. 3*

**ПРЫЁМНАЯ КАМПАНІЯ–2018: РЫХТУЕМСЯ ДА ПАСТУПЛЕННЯ**
Колькі чакаецца абітурыентаў і якія змены адбыліся ў плане прыёму, распавёў адказны сакратар прыёмнай кампаніі Вячаслаў МАЛАФЕЕЎ
*Стар. 4*

**ІНАВАЦЫІ НЕ АДМЯНЯЮЦЬ ТРАДЫЦЫІ**
Пра ўкараненне новых адукацыйных методык на некалькіх факультэтах БДУ
*Стар. 5*

АКТУАЛЬНА



Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА



# Ад аптымізацыі да інавацый

На Прафесарскім сходзе БДУ былі прадстаўлены стратэгічныя мэты развіцця ўніверсітэта і задачы па іх рэалізацыі. Гэта пытанне стала адным з ключавых на пасяджэнні, удзел у якім прынялі звыш 350 дактароў навук і прафесараў ВНУ.

Пра стратэгічныя прыярытэты развіцця БДУ ў сучасных умовах распавёў рэктар БДУ **Андрэй Кароль**. Ён падкрэсліў, што ў аснову стратэгіі пакладзены вынікі праведзенага сістэмнага аналізу дзейнасці ўніверсітэта. Сёння для ўстойлівага і дынамічнага развіцця комплексу БДУ ключавымі з'яўляюцца мэты па павышэнні якасці адукацыі, выбудоўванні кадравай палітыкі з апорай на рэальныя дасягненні ўсіх катэгорый супрацоўнікаў, павелічэнні колькасці ПВС, якія маюць навуковыя ступені, а таксама стварэнні цэласнай сістэмы эфектыўнага ўкаранення вынікаў навуковых даследаванняў, выкананні задач выхаваўчай і ідэалагічнай працы, праз інавацыі ў навучальным працэсе, уваходжанні ў лік 300 (1 %) найлепшых універсітэтаў свету і павелічэнні экспарту адукацыйных паслуг і пазабюджэтных прыбыткаў комплексу БДУ, удасканаленні фінансава-гаспадарчай дзейнасці.

Рэктар БДУ Андрэй Кароль звярнуў увагу, што кожная з мэт мае пэўныя паказчыкі вымярэння і ў наш час ажыццяўляецца сістэмная праца па рэалізацыі пастаўленых задач. У БДУ распрацаваны і з 2018 года рэалізуецца праект «Стратэгіі развіцця кадравага патэнцыялу БДУ». Напрыклад, ужо на 20 % абноўлены склад загадчыкаў кафедраў, сярэдні ўзрост якіх 44 гады, скарочана 20 ставак кіраўнічых работнікаў комплексу БДУ. За кошт аб'яднання ІБМТ і ДІКСТ БДУ праведзена аптымізацыя спецыяльнасцяў эканамічнага і гуманітарнага профіляў, а таксама рэструктурызаваны Інстытут журналістыкі. Распрацаваны і рэалізуецца механізм рэйтынгавай сістэмы аплаты працы для ўсіх катэгорый супрацоўнікаў універсітэта. У ліку рэалізаваных задач адзначана стварэнне сістэмы, якая забяспечвае распрацоўку метадалогіі, зместу і практыкі крэатыўнай адукацыі, накіраванай на падрыхтоўку спецыялістаў, што адпавядаюць патрабаванням XXI стагоддзя. Таксама ў БДУ ўкаранёная новая форма ўзаемадзеяння факультэтаў і інстытутаў з кіраўніцтвам БДУ, паляпшаецца матэрыяльна-тэхнічная база карпусоў і агульнага харчавання і інш. Акрамя таго, былі пазначаны праблемныя палі па рэалізацыі стратэгічных задач і іх магчымыя перспектывы. Прадпрымаюцца захады па правядзенні капітальнага рамонту галоўнага корпуса БДУ.

У рамках прафесарскага сходу таксама адбылося абмеркаванне працы прэзідыума дадзенай супольнасці за 2015–2018 гады. З дакладам пра асноўныя вынікі дзейнасці за ўказаны перыяд выступіў старшыня прэзідыума загадчык кафедры філасофіі і метадалогіі навукі **Анатоль Зелянкоў**. Завяршылася пасяджэнне выбарамі новага складу прэзідыума прафесарскага сходу. Кіраваць грамадскай арганізацыяй наступныя 3 гады даверана прафесару Анатолю Зелянкову. Яго намеснікам стаў загадчык кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта Рыгор Васілевіч.

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**

## Весткі з рэктарата

**ЧАТЫРНАЦЦАЦЬ** супрацоўнікаў Чжэцзянскага Шужэн універсітэта (Кітай) прайшлі ў БДУ праграму павышэння кваліфікацыі «Мадэляванне практыка-арыентаванага навучання: узаемасувязь вышэйшай адукацыі і прафесійнага асяроддзя».

Першы прарэктар акадэмік **Алег Івашкевіч** распавёў пра вопыт супрацоўніцтва з КНР. Усяго кіраўнікі падраздзяленняў БДУ прачыталі больш за 15 лекцый па арганізацыі кіравання сучаснай ВНУ, а таксама правялі практычныя заняткі на тэмы сучасных інфармацыйных тэхналогій, арганізацыі студэнцкіх даследаванняў і працы маладых навукоўцаў у лабараторыях і інш.

**СЕМІНАР** «Актуальныя пытанні кампаніі па засяленні навучэнцаў у інтэрнаты БДУ на 2018/2019 навуч. год» прайшоў пры ўдзеле прарэктара па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях **Івана Янушэвіча** і дырэктара Студэнцкага гарадка **Алы Мелех**. Абмяркоўваліся пытанні нарматыўна-прававых актаў, пераліку неабходных дакументаў, уліку навучэнцаў, ахвотных атрымаць месца ў інтэрнатах БДУ, а таксама карыстання жылым памяшканнем, пакрыцця страт, высялення і інш. Упаўнаважаныя за засяленне навучэнцаў у інтэрнаты змаглі атрымаць прафесійную кансультацыю.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

*Каб скарыстацца мультымедыйным кантэнтам газеты:*

1. *Загрузіце на смартфон прыкладанне **HP Reveal***
2. *Падпішыцеся на канал **#bsuby***
3. *Навядзіце камеру на выяву з пазнакай*

СУПРАЦОЎНІЦТВА

Пытанні далейшай дзейнасці сумеснага інстытута Далянскага ўніверсітэта тэхналогій і БДУ абмеркавалі іх кіраўнікі **Го Дунмін** і **Андрэй Кароль** у рамках візіту беларускай дэлегацыі ў Кітай з 5 па 9 чэрвеня.




# У БДУ будзе створаны інстытут дыстанцыйнай адукацыі

Былі падведзены вынікі першага года працы кітайска-беларускага інстытута, а таксама прааналізаваны эфектыўнасць і якасць выкладання навучальных дысцыплін на кітайскай і англійскай мовах. Дарэчы, у наш час 1 курс паспяхова скончылі 79 кітайскіх студэнтаў фізічнага і механіка-матэматычнага факультэтаў.

Бакі дэталёва абмеркавалі доўгатэрміновыя стратэгіі і задачы Сумеснага беларуска-кітайскага інстытута (СБКІ). Дасягнута дамоўленасць пра ініцыяванне ДУТ унясення Міністэрствам адукацыі КНР змен у статутныя дакументы сумеснага інстытута для навучання студэнтаў па гуманітарных спецыяльнасцях: філасофіі, педагогіцы, журналістыцы і інш. У рамках пасяджэння былі разгледжаны таксама магчымасці падрыхтоўкі аспірантаў і дактарантаў на базе сумеснага інстытута. Важнымі вынікам сустрэчы сталі намеры ўніверсітэтаў адкрыць на базе БДУ сумесны інстытут для падрыхтоўкі беларускіх і замежных грамадзян, а таксама стварыць інстытут дыстанцыйнай адукацыі. Акрамя таго, у ліпені 2018 года для студэнтаў і магістрантаў БДУ фізіка-матэматычнага профілю ў ДУТ арганізуюць чатырохтыднёвую летнюю школу.

Адной з тэм візіту быў разгляд фінансавага ўзаемадзеяння ўніверсітэтаў. У выніку падпісана дадатковая фінансавая дамова паміж ДУТ і БДУ, якая вызначае механізм аплаты экспарту адукацыйных паслуг БДУ.

Рэктар Андрэй Кароль таксама выступіў перад выкладчыкамі і студэнтамі ДУТ з лекцыяй «Усход і (ці) Захад: куды ідзе педагогіка?», правёў прэзентацыю адукацыйных паслуг, навуковых дасягненняў і акадэмічнага патэнцыялу БДУ.

Завяршыўся візіт нашай дэлегацыі ўрачыстай цырымоніяй уручэння кітайскім навучэнцам студэнцкіх білетаў і значкоў з сімволікай БДУ.

**Даведка**

Сумесны інстытут Далянскага ўніверсітэта тэхналогій і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта створаны ў 2017 годзе. У яго склад уваходзяць тры факультэты: прыкладной фізікі, інжынернай механікі, матэматыкі і прыкладной матэматыкі. Сумесная адукацыйная ўстанова функцыянуе ў г. Далянь (КНР). Першы навучальны год пачаўся 1 верасня 2017 г. для 79 кітайскіх грамадзян па дзвюх спецыяльнасцях: «Прыкладная фізіка» і «Інжынерная механіка». У 2017/2018 навуч. г. у СБКІ былі накіраваны 4 выкладчыкі БДУ з мэтай падрыхтоўкі кітайскіх грамадзян па сумесных адукацыйных праграмах, а ў 2018/2019 навуч. г. плануецца павелічэнне колькасці накіраваных выкладчыкаў да 10.

Навучанне і абарона дыпломаў ажыццяўляецца ў ДУТ на англійскай мове. Выпускнікі сумеснага беларуска-кітайскага інстытута атрымаюць два дыпломы: ДУТ і БДУ.

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**

ВАЖНЫЯ РАШЭННІ

# Курс на стварэнне лічбавага ўніверсітэта

Рэктар БДУ **Андрэй Кароль** разам з членамі рэктарата наведаў факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ.




*Выступае дэкан ФРКТ Сяргей Малы*

На сустрэчы з кіраўніцтвам факультэта рэктар агучыў стратэгічныя мэты развіцця БДУ, надаў асаблівую ўвагу эканамічным аспектам факультэта і ВНУ ў цэлым, праграмам падрыхтоўкі спецыялістаў на англійскай мове, асабліва ў аспірантуры, удасканаленню сістэмы ўзаемадзеяння з заказчыкамі кадраў, выкарыстанню крэатыўных метадык навучання студэнтаў, павелічэнню публікацыйнай актыўнасці, падрыхтоўцы навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі. Была акцэнтавана неабходнасць актыўнага прыцягнення працадаўцаў да падрыхтоўкі будучага спецыяліста, а таксама выканання дыпломных і магістарскіх праектаў у адпаведнасці з запатрабаваннямі прадпрыемстваў.

Дзейсным стала абмеркаванне пытання экспарту адукацыйных паслуг і камерцыялізацыі дзейнасці факультэта. Загадчыкі кафедраў выступілі са сваімі ініцыятывамі і ўказалі на шэраг праблем па іх рэалізацыі. Адна з іх тычыцца запатрабаванасці ў замежнікаў поўнага пакета адукацыйных паслуг, які ўключае сацыяльна-побытавы сэрвіс. Факультэту даручана распрацаваць змест запатрабаваных на знешнім рынку адукацыйных праграм на англійскай мове і план іх прасоўвання. Акрамя таго, кіраўніцтва БДУ падкрэсліла магутны навуковы патэнцыял факультэта, які можа спрыяць развіццю замежнай аспірантуры. У якасці матывацыйнага кампанента прынята рашэнне пра распрацоўку механізму аплаты працы выкладчыкаў, што ажыццяўляюць эфектыўнае кіраўніцтва дысертацыйнымі працамі замежнікаў.

У разрэзе пытання якасці адукацыі ўдзельнікі сустрэчы разгледзелі ўкараненне ў навучальны працэс новых метадык і магчымасці дыферэнцыяваных тэрмінаў, індывідуальнай траекторыі падрыхтоўкі студэнтаў. Былі актуалізаваны пытанні, якія тычацца назвы спецыяльнасцяў, узаемадзеяння з кіраўнічымі структурамі ВНУ, патэнтаў і іх камерцыйнага складніка, а таксама стварэння на базе факультэта лічбавага ўніверсітэта.

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**

# План навучання на англійскай мове

На сустрэчы рэктара **Андрэя Караля** з кіраўніцтвам ФПМІ адмысловая ўвага была нададзена распрацоўцы англамоўных магістарскіх праграм, індывідуалізацыі навучальнага працэсу, павелічэнню абарон дысертацый, а таксама публікацыйнай актыўнасці супрацоўнікаў.

Цэнтрам абмеркавання сталі стратэгічныя задачы, актуальныя як для факультэта, так і для БДУ ў цэлым. У ліку разгледжаных пытанняў якасць адукацыі, дыстанцыйнае навучанне, экспарт навукаёмістай прадукцыі і адукацыйных паслуг. Для ўдасканалення сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў адзначана неабходнасць рэалізацыі ў навучальным працэсе новых методык і формаў навучання, арыентаваных на фарміраванне ў студэнтаў крэатыўных кампетэнцый.

Адмысловая ўвага была нададзена актывізацыі працы кафедраў па распрацоўцы англамоўных магістарскіх праграм, індывідуалізацыі навучальнага працэсу, павелічэнню абарон кандыдацкіх, доктарскіх прац, а таксама публікацыйнай актыўнасці супрацоўнікаў. Для рашэння гэтых праблем рэктар Андрэй Кароль даў даручэнне ў найбліжэйшы час падрыхтаваць план развіцця спецыяльнасцяў на англійскай мове для ўсіх узроўняў навучання, уключаючы аспірантуру, прапрацаваць магчымасць укаранення па асобных дысцыплінах методык крэатыўнай адукацыі, а таксама распрацаваць праграму развіцця кадравага патэнцыялу факультэта і план камерцыялізацыі навукаёмістай высокатэхналагічнай прадукцыі.

Таксама ўдзельнікі сустрэчы абмеркавалі тэму стварэння навукова-адукацыйнага галіновага цэнтра. Прынята рашэнне распрацаваць палажэнне пра кластарную форму падрыхтоўкі IT-спецыялістаў, якая ўключала б навучальны кампанент, навукова-даследчую і вытворчую дзейнасць студэнтаў.

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**

МАНІТОРЫНГ

# Сусветныя рэйтынгі і дынаміка ў іх БДУ

Апошнія гады БДУ паслядоўна ўмацоўваў пазіцыі ў міжнародных рэйтынгах, і гэта моцна вылучала яго на фоне іншых беларускіх ВНУ і прыцягвала абітурыентаў, асабліва з іншых краін. Мы пагаварылі з намеснікам старшыні савета па павышэнні рэйтынгу БДУ ў сусветнай навукова-адукацыйнай прасторы **Аляксеем Толсцікам** пра алгарытмы дадзеных рэйтынгаў і сістэму каардынат, у якой круціцца наша ВНУ.




Інфаграфіка Валерыі БАНДАРЧЫК

***– Аляксей Леанідавіч, з 2011 года пад Вашым кіраўніцтвам дзейнічала працоўная група па рэйтынгу. Як ацэньваеце эфектыўнасць яе працы і ўзаемадзеянне з падраздзяленнямі?***

– Працоўная група «Рэйтынг БДУ» была створана з мэтай прасоўвання БДУ ў сусветных рэйтынгах, шырэйшай папулярызацыі ўніверсітэта ў краіне і за мяжой, павышэння прывабнасці сярод абітурыентаў. Характэрна, што на той момант мы ўваходзілі толькі ў адзін рэйтынг Webometrics і займалі 1476 месца. У студзені 2018 года мы выйшлі на 487 месца, прычым гэта другі вынік сярод універсітэтаў СНД пасля Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава. Сярод вынікаў працы групы можна вылучыць уваходжанне ўніверсітэта ў дзясятак іншых міжнародных рэйтынгаў. У выніку, паводле дадзеных самых аўтарытэтных міжнародных рэйтынгавых агенцтваў, БДУ ўваходзіць у 2 % найлепшых універсітэтаў свету, займаючы высокія пазіцыі сярод амаль 30 тысяч устаноў вышэйшай адукацыі.

***– Якія рэйтынгі найбольш аўтарытэтныя?***

– У 2017 годзе БДУ ўпершыню ўвайшоў у найстарэйшы і адзін з самых прэстыжных сусветных рэйтынгаў – Шанхайскі прадметны рэйтынг універсітэтаў па фізіцы – і заняў месца ў групе 401–500. Раней ніводзін беларускі ўніверсітэт не ўваходзіў у лік універсітэтаў, якія ранжыруюцца Шанхайскім рэйтынгам. БДУ таксама з'яўляецца адзіным беларускім універсітэтам, прадстаўленым ва ўплывовым рэйтынгу Times Higher Education. Не менш вядомы рэйтынг вядомага брытанскага агенцтва QS, на які арыентуюцца ўніверсітэты Расіі. У чэрвені 2018 года БДУ заняў 354 месца ў свеце. Пры гэтым Электронная бібліятэка БДУ займае другое месца сярод электронных бібліятэк ВНУ з краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і першае месца сярод краін СНД. У снежні 2017 года БДУ ўпершыню ўвайшоў у 200 найлепшых універсітэтаў свету па версіі Маскоўскага міжнароднага рэйтынгу «Тры місіі ўніверсітэта» (MosIUR), заняўшы 168 пазіцыю. Гэта прынцыпова новы акадэмічны рэйтынг, які ацэньвае тры ключавыя місіі ўніверсітэта: адукацыйную, навуковую і ўзаемадзеянне з грамадствам.

***– Наколькі, на Ваш погляд, наогул аб'ектыўныя пазіцыі ВНУ ў дадзеных рэйтынгах?***

– Розныя рэйтынгі робяць акцэнт на розныя сферы дзейнасці ўніверсітэтаў. Акрамя адукацыйнага працэсу гэта можа быць і навукова-даследчая праца, і ўкараненне вынікаў даследаванняў у вытворчасць, і паспяховасць працы выпускнікоў. Шэраг агенцтваў, акрамя аб'ектыўных колькасных параметраў, ацэньваюць меркаванні экспертаў як з боку акадэмічнай супольнасці (універсітэты, навуковыя цэнтры), так і з боку працадаўцаў (прадпрыемствы, арганізацыі і розныя фірмы, у якіх працуюць выпускнікі). Напрыклад, рэйтынгавыя агенцтвы QS і Times Higher Education маюць базы экспертаў, якія ўключаюць некалькі дзясяткаў тысяч вядомых навукоўцаў і кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый. Такі шматбаковы погляд уяўляецца досыць аб'ектыўным, аднак варта мець на ўвазе, што пры ацэнцы, напрыклад, навуковых публікацый акцэнт робіцца на англамоўныя выданні, што, вядома, заніжае пазіцыі ўніверсітэтаў краін СНД.

Таксама адзначу, што ў рэйтынгах дамінуюць універсітэты з вялікім фінансаваннем, напрыклад, бюджэт вядучых амерыканскіх універсітэтаў даходзіць да 10 млрд долараў. Кітайскія ўніверсітэты выходзяць на высокія пазіцыі, бо таксама атрымалі істотную фінансавую падтрымку, што дазваляе на новым узроўні арганізоўваць навучальны працэс, развіваць навуковыя даследаванні і вытворчасць прадукцыі.

***– Калі суаднесці пазіцыі БДУ з пазіцыямі ВНУ з суседніх краін, да якіх высноў можна прыйсці?***

– У нас добрыя пазіцыі сярод краін СНД. Па шэрагу рэйтынгаў, у тым ліку тых, якія праводзяцца расійскімі агенцтвамі, мы ўваходзім у пяцёрку найлепшых універсітэтаў. Аднак варта быць аб'ектыўным і адзначыць вельмі добрую дынаміку расійскіх універсітэтаў за апошнія



*Аляксей Толсцік*

гады. Гэта вынік выканання праграмы ўрада Расіі «5-100», па выніках якой 5 універсітэтаў Расіі павінны ўвайсці ў сотню найлепшых універсітэтаў свету. У рамках праграмы 15 універсітэтам вылучаюцца дадатковыя фінансавыя сродкі ў памеры каля 10 мільёнаў долараў для развіцця навуковых даследаванняў, уключаючы закупку абсталявання, прэміяванне выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў за публікацыі ў вядучых часопісах, якія ўваходзяць у базы дадзеных Scopus і Web of Science. У выніку, па дадзеных агенцтва QS, на чэрвень 2018 года 15 расійскіх універсітэтаў увайшлі ў 500 найлепшых ВНУ свету, прычым ужо 8 з іх абышлі наш універсітэт (МДУ – 90, СПбДУ – 235, Новасібірскі ўніверсітэт – 244, Томскі – 277, МДТУ імя Баўмана – 299, МФТІ – 312, МІФІ – 329, НДУ «Вышэйшая школа эканомікі» – 343). Сярод найлепшых універсітэтаў іншых суседніх краін наша 354 месца выглядае вельмі прэстыжна (Варшаўскі ўніверсітэт – 394, Харкаўскі нацыянальны ўніверсітэт імя В. Н. Каразіна – 481, Вільнюскі ўніверсітэт – 488).

***– Па якіх параметрах за апошні час БДУ палепшыў свае паказчыкі, і ў чым заключаюцца нашы рэзервы?***

– У нас традыцыйна добрыя ацэнкі міжнародных экспертаў, і гэта заслуга ўсяго нашага калектыву. Хачу выказаць падзяку выкладчыкам, навуковым работнікам і ўсім супрацоўнікам, без актыўнай працы якіх мы не дасягнулі б такіх добрых вынікаў. Істотную ролю іграе акадэмічная мабільнасць – штогод каля тысячы нашых студэнтаў і столькі ж выкладчыкаў выязджаюць за мяжу на канферэнцыі, стажыроўкі, навучальныя практыкі, конкурсы. Усё гэта – павышэнне прэстыжу нашага ўніверсітэта на міжнароднай арэне. Нашы рэзервы – публікацыі ў вядучых навуковых часопісах, міжнароднае супрацоўніцтва (прыцягненне замежных студэнтаў і замежных выкладчыкаў).

Аналізуючы дынаміку расійскіх універсітэтаў, адназначна відавочная выніковасць праграмы «5-100». Для нашай краіны можна было б стварыць праграму «3-300» з аналагічнай сістэмай фінансавай падтрымкі, па выніках выканання якой 3 ВНУ павінны былі б увайсці ў 300 найлепшых універсітэтаў свету.

Трэба памятаць, што паляпшэнне нашых паказчыкаў неабходна суадносіць з іншымі ўніверсітэтамі, якія не стаяць на месцы, а інтэнсіўна развіваюцца. Гэта як з Алісай у краіне Залюстрэчча: «... Ну і павольная тамтэйшая ваша краіна! – грэбліва кінула Каралева. – У нас даводзіцца несціся з апошніх сіл, каб толькі ўтрымацца на месцы. А ўжо калі жадаеш пасунуцца, то ляці ў два разы хутчэй».

***– БДУ пры новым рэктару пачаў перабудоўваць сваю дзейнасць па шматлікіх напрамках – як гэта адаб'ецца на рэйтынгавых пазіцыях нашага ўніверсітэта, і якія Вашы прагнозы?***

– У 2018 годзе быў створаны савет па павышэнні рэйтынгу БДУ ў сусветнай навукова-адукацыйнай прасторы, які ўзначаліў першы прарэктар Алег Анатольевіч Івашкевіч. У наш час ідзе структурная перабудова і пераразмяркоўваецца функцыянал паміж падраздзяленнямі, развіваецца сістэма «Электронны ўніверсітэт», створаны асабістыя кабінеты супрацоўнікаў, якія, на мой погляд, павінны атрымаць шырэйшае напаўненне, напрыклад, магчымасць самім супрацоўнікам размяшчаць свае публікацыі, якія будуць аўтаматычна размяшчацца ў Электроннай бібліятэцы і ўлічвацца пры вызначэнні асабістага рэйтынгу. Ёсць упэўненасць, што працы па павышэнні рэйтынгу БДУ будзе нададзена досыць увагі з боку кіраўнікоў розных падраздзяленняў нашага ўніверсітэта, што дазволіць годна выглядаць на сусветным узроўні.

**Гутарыў**
**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

## НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

**04 ліпеня Фурсевіч Людміла Аркадзьеўна,** намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення бухгалтарскага ўліку і фінансаў

**05 ліпеня Ваганава Ала Мікалаеўна,** дацэнт кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін

**09 ліпеня Вашчанка Святлана Валянцінаўна,** дацэнт кафедры неарганічнай хіміі

**12 ліпеня Афанасьева Таццяна Сяргееўна,** дацэнт кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі

**21 ліпеня Аўсяннікава Святлана Васільеўна,** вядучы навуковы супрацоўнік НДЛ радыяхіміі

**21 ліпеня Шцін Сяргей Львовіч,** дацэнт кафедры функцыянальнага аналізу і аналітычнай эканомікі

**25 ліпеня Высоцкая Надзея Фёдараўна,** прафесар кафедры этналогіі, музеалогіі і гісторыі мастацтва

**26 ліпеня Матуліс Вадзім Эдвардавіч,** дацэнт кафедры неарганічнай хіміі

**26 ліпеня Матуліс Віталь Эдвардавіч,** дацэнт кафедры неарганічнай хіміі

**29 ліпеня Слабадзянюк Анатоль Іванавіч,** загадчык кафедры агульнай фізікі

**29 ліпеня Струк Таццяна Рыгораўна,** дацэнт кафедры карпаратыўных фінансаў

**30 ліпеня Расолька Ала Іванаўна,** дацэнт кафедры фізічнага выхавання і спорту

## АБ'ЯВЫ

**ФАКУЛЬТЭТ ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ І ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ БДУ**
**ЗАПРАШАЕ НА ПЕРАПАДРЫХТОЎКУ:**

- асобаў, якія маюць вышэйшую адукацыю;
- студэнтаў дзённай формы навучання двух апошніх курсаў і магістратуры вышэйшых навучальных устаноў

па спецыяльнасці
**«РУСКАЯ МОВА ЯК ЗАМЕЖНАЯ» (кваліфікацыя «Выкладчык рускай мовы як замежнай»)**

Навучанне ажыццяўляецца па завочнай форме на платнай аснове.

Тэрмін прыёму дакументаў да 05 лістапада (штогод).

Прыём дакументаў: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 503, 418.

Кантакты: тэл. 259-70-72, тэл./факс 259-70-16, e-mail: jour_fpk@bsu.by, http://www.journ.bsu.by

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Інтэрв'ю прарэктара БДУ па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях Вольгі Чупрыс «Настаўніцкай газеце»** – «Настаўніцкая газета», nastgaz.by (23.06).

**Пра правядзенне антытытунёвай акцыі ў сацыяльных сетках БДУ** – sb.by, wuz.by, 21.by, «Мінск-навіны» (29.05), «Знамя юности» (07.06).

**Чацвёртакурснік ФПМІ БДУ Анатоль Макарэвіч заняў другое месца на конкурсе «Найлепшая курсавая праца па эканамічнай тэматыцы сярод студэнтаў ВНУ»** – wuz.by (01.06), sb.by, «Знамя юности» (07.06).

**Пра распрацоўку навукоўцамі БДУ «біяўпакоўкі» для доўгачасовага захоўвання хуткапсавальных прадуктаў** – БелТА, agronews.com, sb.by, АНТ, wuz.by (07.06), polymia.by, kp.by, zviazda.by, gp.by, gomel.today, ecopress.by, milkprofi.by, informupack.ru, sozh.info (08.06), «Мінск-навіны» (09.06).

**Пра распрацоўку навукоўцамі БДУ ўнікальных вітамінных і мінеральных комплексаў «Славяна» і «Лада» для вытворчасці хлебабулачнай і экструзійнай прадукцыі для цяжарных і кормячых жанчын** – interfax.by, wuz.by, bezboleznej.ru (11.06), 21.by (12.06), agronews.com (13.06).

**Міжнародны круглы стол для вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі адбыўся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце** – ecopress.by, wuz.by (13.06), «Мінск-навіны» (20.06).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

# Рыхтуемся да паступлення

Першыя іспыты цэнтралізаванага тэсціравання ўжо мінулі, і вось-вось у БДУ пачнецца прыёмная кампанія. Колькі чакаецца абітурыентаў і якія змены адбыліся ў плане прыёму, распавёў адказны сакратар прыёмнай кампаніі дэкан факультэта даўніверсітэцкай адукацыі **Вячаслаў Малафееў.**



Фота Васіля КУЗЬМІЧОНКА

## Цэнтралізаванае тэсціраванне

Сёлета на ЦТ у БДУ зарэгістравалася 15 648 чалавек, гэта менш, чым летась, калі ў нашым універсітэце з улікам рэзервовых дзён было праведзена 17 170 тэстаў. «Такое зніжэнне часткова звязана з тым, што зараз сертыфікаты ЦТ сапраўдныя на працягу двух гадоў. Адпаведна, тыя, хто не паступіў летась, могуць паспрабаваць свае сілы ў гэтым, не здаючы тэсты зноў. Дарэчы, з мінулага года ў нас засталася вялікая колькасць сертыфікатаў, але на працягу мая гэтага года іх забіралі», – распавядае Вячаслаў Міхайлавіч.

Для тых, хто па паважлівай прычыне не зможа здаць тэсты па графіку, прадугледжаны 3 рэзервовыя дні. Гэтай магчымасцю актыўна карыстаюцца і грамадзяне такіх краін, як Расія, Казахстан, Кыргызстан і Таджыкістан, якія могуць паступаць у наш універсітэт на аднолькавых умовах з грамадзянамі Беларусі. «Гэтыя абітурыенты здаюць у сябе ў краінах выпускныя іспыты і не паспяваюць прыехаць да нас на ЦТ у чэрвені, – тлумачыць Вячаслаў Міхайлавіч. – Аднак у іх ёсць магчымасць здаць тэсты ў рэзервовыя дні, таму мы думаем, што колькасць паступаючых з гэтых дзяржаў павялічыцца».

У цэлым, цэнтралізаванае тэсціраванне праходзіць досыць інтэнсіўна, у якасці арганізатараў задзейнічана больш за 500 выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ.

## План прыёму

Усяго БДУ прыме на навучанне 5142 чалавекі, гэта на 190 абітурыентаў менш, чым летась. Змены ў плане прыёму – вынік аптымізацыі. Так, на дзённай бюджэтнай форме стала на 56 месцаў менш: пад скарачэнне патрапілі гуманітарныя і сацыяльна-эканамічныя спецыяльнасці – 67 месцаў, але ў той жа час на 11 месцаў павялічыўся план прыёму на прыродазнаўчанавуковых спецыяльнасцях. У прыватнасці, больш абітурыентаў сёлета прымуць на спецыяльнасці, звязаныя з інфармацыйнымі тэхналогіямі. У выніку на дзённай бюджэтнай форме навучання выйшлі на наступныя суадносіны ў размеркаванні планавых месцаў: 68 % – прыродазнаўчанавуковыя спецыяльнасці, 32 % – гуманітарныя і сацыяльна-эканамічныя.



*Вячаслаў Малафееў лічыць, што прыёмная кампанія будзе праходзіць дынамічна і план набору будзе выкананы*

На дзённай платнай форме навучання таксама назіраецца тэндэнцыя скарачэння плана прыёму на гуманітарныя і сацыяльна-эканамічныя спецыяльнасці – на 70 месцаў (галоўным чынам гэта эканамічныя спецыяльнасці) і вылучэнне дадатковых на прыродазнаўчанавуковых – 7 месцаў.

У апошнія гады ў краіне паступова скарачаюць завочную форму навучання. У БДУ сёлета план прыёму паменшыўся на 85 месцаў: на бюджэтнай форме – 29, на платнай – 56. Выніковы план прыёму на завочную форму складае: 226 бюджэтных і 943 платныя месцы. Як адзначае Вячаслаў Міхайлавіч, дадзены план у дачыненні да бюджэтнай формы досыць аптымальны, а вось месцы на завочную платную форму навучання ў далейшым яшчэ будуць скарачаць. Дарэчы, Юрыдычны каледж БДУ ажыццяўляць прыём на завочную форму сёлета не будзе наогул.

Таксама сёлета БДУ прыме менш выпускнікоў УССА, якія навучаліся па інтэграваных планах, на скарочаную форму навучання. Агульны план прыёму складае 404 месцы, гэта на 40 месцаў менш, чым летась. «Скарачэнне звязана з тым, што летась план па скарочанай форме быў выкананы на 93 %, гэта значыць, засталося не занята 21 месца. Гэтыя абставіны былі ўлічаны, і план аптымізавалі».

Паступова павялічваецца план прыёму на мэтавае навучанне – 53 месцы (у мінулым годзе 44). І калі раней па мэтавым прыёме прымалі галоўным чынам будучых педагогаў і журналістаў, то цяпер набор ажыццяўляецца па 18 спецыяльнасцях. Вячаслаў Міхайлавіч адзначае: «Сёлета ёсць заяўкі на спецыяльнасць «мытная справа» – 6 месцаў, а атамная электрастанцыя, якая будуецца, запытала 5 месцаў. І, дарэчы, па педагагічных спецыяльнасцях вялікая колькасць месцаў вылучана менавіта Астравецкаму раёну, цяпер там фарміруецца магутная інфраструктура, для якой патрабуецца вялікая колькасць падрыхтаваных кадраў».

## Замежныя абітурыенты

Апошнія некалькі гадоў БДУ на першую ступень вышэйшай адукацыі прымаў каля 400 замежных грамадзян, не меншая колькасць абітурыентаў з іншых краін чакаецца і сёлета. Для гэтага ёсць падставы: досыць вялікі выпуск на падрыхтоўчым аддзяленні БДУ – 239 чалавек (летась 180), значная частка якіх настроена на далейшае навучанне ў нашым універсітэце. Акрамя таго, актыўна працуюць сумесныя адукацыйныя праграмы, у рамках якіх замежныя грамадзяне спачатку 1–2 гады навучаюцца ў сябе ў краіне, а затым на 2–3 курс прыязджаюць вучыцца да нас. Такога роду дамовы падпісаны з Таджыкскім нацыянальным універсітэтам і трыма ўніверсітэтамі Кітая, навучанне вядзецца па 7 спецыяльнасцях. Летась БДУ прыняў больш за 80 такіх студэнтаў, сёлета па прагнозах чакаюць не менш.

Яшчэ адна тэндэнцыя апошніх гадоў – цікавасць замежных грамадзян да магістратуры: штогод у БДУ прыязджае больш як 200 чалавек. У гэтым напрамку развіваюцца сумесныя магістарскія праграмы па сістэме «Адзін плюс адзін», калі адзін год навучанне ідзе ў БДУ, а другі – ва ўніверсітэтах-партнёрах, сярод якіх Універсітэт Мітвайда (Германія), Хэнанскі ўніверсітэт (Кітай). «Па магістарскіх праграмах падпісаны дамовы яшчэ з трыма ўніверсітэтамі Кітая, і мы спадзяёмся, што яны пачнуць працаваць ужо з наступнага навучальнага года».

## Прагнозы

Прыёмная кампанія будзе праходзіць гэтак жа дынамічна, як летась. Апошні тэст у рэзервовы дзень абітурыенты напішуць 10 ліпеня, а ўжо з 12 чысла пачнецца прыём дакументаў. Самы вялікі наплыў паступаючых – да 1000 чалавек у дзень – чакаецца ў перыяд з 12 па 17 ліпеня, калі абітурыенты будуць падаваць дакументы на бюджэтную форму навучання і на спецыяльнасці, дзе прадугледжаны ўнутраныя іспыты. «Вядома, гэта высокая нагрузка на грамадскую прыёмную камісію. Цяпер ідзе падрыхтоўка каля 60 чалавек, якія будуць працаваць у складзе тэхнічнага сакратарыята прыёмнай камісіі, вельмі шмат будзе залежаць ад іх працы, – распавядае Вячаслаў Міхайлавіч. – Акрамя таго, як і летась, мы прадстаўляем абітурыентам магчымасць завесці асабісты кабінет, дзе можна самастойна запоўніць усе неабходныя дакументы, размясціць фатаграфію, а пасля падачы дакументаў у рэжыме анлайн сачыць за конкурсам і прахаднымі баламі».

Па прагнозах, на спецыяльнасці БДУ на ўсе формы навучання падасць дакументы не менш за 10 тысяч абітурыентаў. Вячаслаў Міхайлавіч адзначае, што з іншымі ўніверсітэтамі на полі роднасных спецыяльнасцяў будзе досыць сур'ёзная канкурэнцыя, аднак праведзеная ў нашым універсітэце прафарыентацыйная праца са школьнікамі: дні адчыненых дзвярэй, праект «Студэнт на тыдзень», удзел БДУ ў рэспубліканскіх і міжнародных адукацыйных выставах, а таксама сур'ёзная праца па плананаванні прыёму з улікам вынікаў мінулага года – даюць падставы чакаць, што план прыёму будзе выкананы.

**Валерыя БАНДАРЧЫК**

# Конкурс у ліцэй узрос

Агульны конкурс у Ліцэй БДУ склаў 6,6 чалавека на месца.

У Ліцэі БДУ завяршылася ўступная кампанія. Усяго было пададзена для паступлення 1558 заяў. Найбольшая колькасць у біялагічныя класы – 359. Конкурс тут склаў 9,3 чалавека на месца. На паступленне ў матэматычны клас зарэгістраваліся 297 абітурыентаў (конкурс – 7,5 чалавека на месца), у фізічны – 250 (конкурс – 6,2), інфармацыйна-матэматычны – 161, гісторыка-грамадазнаўчы – 137, філалагічны (англ.) – 140, хімічны – 130, філалагічны (рус.) – 84. Такім чынам, агульны конкурс склаў 6,6 чалавека на месца, што на 0,3 адзінкі вышэй за леташні паказчык.

З агульнага ліку абітурыентаў 31 чалавек залічаны без іспытаў. Гэта пераможцы заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды (дыпломы I, II ці III ступені) па фізіцы, матэматыцы, інфарматыцы, хіміі, біялогіі, гісторыі, грамадазнаўстве, рускай мове і літаратуры, беларускай мове і літаратуры, англійскай мове.

Залічэнне ў 10 класы ажыццяўлялася па выніках двух пісьмовых уступных выпрабаванняў, якія прайшлі 13 і 20 мая.

Адзначым, што навучанне ў Ліцэі БДУ вядзецца па сямі напрамках: матэматычным, фізічным, хімічным, біялагічным, інфарматыка-матэматычным, філалагічным і гісторыка-грамадазнаўчым.

Усяго ў 2018/19 навучальным годзе плануецца адкрыць дванаццаць класаў: па два матэматычныя, фізічныя, біялагічныя, філалагічныя, гісторыка-грамадазнаўчыя і па адным хімічным і інфарматыка-матэматычным.

**Ульяна МІНЧАНКА**

Вучэбна-метадычная лабараторыя інавацый у адукацыі (ВМЛІА) пачала сваю працу сёлета ў студзені. Яна была створана для правядзення даследчай і метадычнай работы, накіраванай на адаптацыю інавацыйных крэатыўных адукацыйных тэхналогій да практыкі навучальнага працэсу. Пра працу і планы лабараторыі, пра ўкараненне новых адукацыйных методык у навучанне распавяла кіраўнік падраздзялення **Наталля Марозава.**



Фота Аляксандра ЗАПОЛЬСКАГА

# Інавацыі не адмяняюць традыцыі

## Пра ўкараненне новых тэхналогій у адукацыю

Вучэбна-метадычная лабараторыя інавацый у адукацыі займаецца каардынацыяй дзейнасці выкладчыкаў БДУ, звязанай з арганізацыяй навучання з выкарыстаннем дыстанцыйных тэхналогій, павялічвае прафесійную кампетэнтнасць выкладчыкаў, а таксама ўмацоўвае міжуніверсітэцкае супрацоўніцтва ў галіне ўдасканалення адукацыйнага працэсу.

Кіраўніцтвам БДУ былі вызначаны 5 факультэтаў для апрабацыі і разумнага ўкаранення дыстанцыйных тэхналогій у адукацыйны працэс. Сумеснымі намаганнямі супрацоўнікаў лабараторыі і выкладчыкаў факультэтаў будуць прадпрынятыя крокі па абнаўленні зместу навучальных праграм і фармаў правядзення навучальных заняткаў.

– Факультэты дапамогуць нам распрацаваць нарматыўную дакументацыю па арганізацыі і вучэбна-метадычным забеспячэнні заняткаў, якія праводзяцца з выкарыстаннем інавацыйных (у тым ліку дыстанцыйных) адукацыйных тэхналогій, – кажа Наталля Марозава. Лабараторыя ўжо цяпер аказвае дапамогу факультэтам у планаванні і арганізацыі заняткаў з выкарыстаннем дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій (ДАТ).

## Дыстанцыйныя адукацыйныя тэхналогіі ў БДУ

– Дыстанцыйныя адукацыйныя тэхналогіі выкарыстоўваліся ва ўніверсітэце і раней: існаваў адукацыйны партал, праводзіліся конкурсы адукацыйных анлайн-рэсурсаў, але гэта не атрымала шырокага прымянення падчас падрыхтоўкі спецыялістаў. Паколькі дыстанцыйнае навучанне – гэта ў першую чаргу інструмент, а ў працы над удасканаленнем адукацыйнага працэсу мы плануем закрануць і метадалогію дыстанцыйнага навучання, будуць змяняцца падыходы і формы падачы матэрыялу. У нашы дні даступная любая інфармацыя, і адмысловая ўвага ў гэтай сувязі павінна надавацца развіццю крытычнага мыслення, якое дазваляе яе адбіраць і аналізаваць, – канстатуе Наталля Марозава.

Выкарыстанне сучасных інфармацыйных адукацыйных тэхналогій дае ўніверсітэту пэўныя перавагі. Гэта эканомія на абслугоўванні аўдыторнага фонду, і адносна нізкі сабекошт навучання, які забяспечваецца ў выніку выкарыстання больш канцэнтраванага і ўніфікаванага зместу адукацыйных праграм, больш эфектыўнага выкарыстання навучальных плошчаў і тэхнічных сродкаў. Акрамя таго, выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій дазваляе выкладчыку размясціць тэматычную інфармацыю на пэўным рэсурсе, раўнамерна размеркаваць навучальную працу, выкарыстоўваць тэхналогіі эўрыстычнага навучання. Такім чынам, усталёўваецца мабільная зваротная сувязь паміж выкладчыкам і слухачом. Студэнт, у сваю чаргу, зможа стварыць свой унікальны адукацыйны «прадукт», рэалізаваць творчы патэнцыял, маючы не толькі доступ да электронных бібліятэк і базаў ведаў, але і шырокі спектр інтэрактыўных магчымасцяў.

– Вядома ж, у арганізацыі адукацыйнага працэсу з выкарыстаннем дыстанцыйных тэхналогій ёсць і свае складанасці: гэта неабходнасць пастаяннага доступу да крыніц інфармацыі, запатрабаванне ў тэхнічнай абсталяванасці, слабая распрацоўка вучэбна-метадычнага матэрыялу з прычыны недастатковасці вопыту ў стварэнні неабходнага адукацыйнага кантэнту. З маштабам БДУ не параўнаецца ніводная іншая ВНУ краіны, – падкрэслівае Н. Марозава, – аднак на любыя пераўтварэнні патрэбны часавы рэсурс, каб і студэнты, і выкладчыкі змаглі перабудавацца для працы ў новым рэжыме.

Супрацоўнікі ВМЛІА адзначаюць, што ўкараненне дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій варта ажыццяўляць паэтапна. Спачатку ўжыванне дыстанцыйных тэхналогій закране толькі кіруемую самастойную працу, а затым – лекцыйныя і практычныя заняткі з выкарыстаннем відэалекцый, вэбінараў, відэаканферэнцый, трэнажораў, анлайн-трэнінгаў, інтэрнэт-семінараў і інш.

## Укараненне сучасных адукацыйных тэхналогій на журфаку

Наталля Марозава распавядае, што першым факультэтам, дзе праходзіць апрабацыя ўкаранення сучасных адукацыйных тэхналогій, стаў факультэт журналістыкі. На дадзеным этапе ідзе праца па ўдасканаленні макета навучальнай праграмы. Гэта першы базавы дакумент, важны не толькі для выкладчыка, але і для ўніверсітэта ў цэлым, паколькі ў ім знаходзіць адлюстраванне змястоўная частка дысцыпліны, метады і тэхналогіі выкладання.

На факультэце журналістыкі будзе актуалізаваны змест шэрагу дысцыплін. Дзяржаўны кампанент навучальнага плана спецыяльнасці складана карэкціраваць, а вось універсітэцкі кампанент можна дапаўняць аўтарскімі курсамі, што і будзе адрозніваць наш універсітэт ад астатніх навучальных устаноў. На факультэце ўжо цяпер ідзе ўдасканаленне зместу больш чым 20 дысцыплін.

У наш час вядзецца актыўная кансультацыйная праца па інтэграцыі традыцыйнага адукацыйнага працэсу і інавацый. Традыцыі не адмяняюць інавацыі – пад такім лозунгам, як сказала Н. Марозава, вядзецца праца ў вучэбна-метадычнай лабараторыі.

З выкладчыкамі і кіраўніцтвам факультэта журналістыкі супрацоўнікі лабараторыі сустракаліся ўжо неаднаразова. У выніку быў сфарміраваны план мерапрыемстваў па пашырэнні выкарыстання ДАТ і практыкі прымянення крэатыўных адукацыйных тэхналогій пры падрыхтоўцы спецыялістаў на 1 і 2 ступенях вышэйшай адукацыі. У планах ВМЛІА – развіццё дыстанцыйных тэхналогій з ухілам на распрацоўку адкрытых інтэрнэт-заданняў як асноўнага змястоўнага элемента эўрыстычнага навучання. Выкладчыкам факультэта было прапанавана ўключыць у вучэбна-праграмную дакументацыю апісанне інавацыйных падыходаў і метадаў.

## Адукацыйны партал

Задача адукацыйнага партала заключаецца не ў тым, каб выцесніць традыцыйнае навучанне, а ў тым, каб эфектыўна інтэгравацца ў яго. Навучальны працэс з выкарыстаннем дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій будзе ажыццяўляцца праз адукацыйны партал на базе LMS Moodle. Выкарыстанне электронных навучальных рэсурсаў, распрацаваных у Moodle, дазволіць развіць прафесійныя кампетэнцыі студэнтаў, павялічыць іх сацыяльную мабільнасць, далягляд і ўзровень самасвядомасці, што, вядома, будзе спрыяць не толькі росту адукацыйнага патэнцыялу студэнцтва, але і якасці адукацыі ў цэлым.

Тэхнічную падтрымку дадзенага праекта, па словах кіраўніка лабараторыі інавацый у адукацыі, аказвае Цэнтр інфармацыйных тэхналогій БДУ. У дадзены момант адукацыйны партал знаходзіцца ў тэставым рэжыме.

***Алена ЛЯЎШЭНЯ***

## Кампетэнтна

**Вольга САМУСЕВІЧ, в. а. дырэктара Інстытута журналістыкі:**



– Зараз вялікая ўвага надаецца журналісцкай падрыхтоўцы, прыйшоў час мяняць вучэбныя планы, падыходы да навучання. І новыя сучасныя тэхналогіі, якія ёсць у сістэме адукацыі, трэба прымяняць найперш на творчых факультэтах, такіх як наш. Асноўная задача – каб студэнт змог рэалізаваць свой патэнцыял. Працу па абнаўленні вучэбнага працэсу мы не адкладвалі на восень, а цяпер вызначылі пры абмеркаваннях на кожнай кафедры 2–3 дысцыпліны, у якія можна ўключыць новыя тэхналогіі ўзаемадзеяння, дыстанцыйныя і крэатыўныя методыкі. Выкладчыкі самі зацікаўлены ў новых формах выкладання матэрыялу. Паспрабуем з першага верасня выкладаць прадметы з улікам новых распрацовак.

**Святлана ХАРЫТОНАВА, загадчыца кафедры перыядычнага друку факультэта журналістыкі:**



– Імклівa развіваюцца тэхналогіі, мы павінны прапанаваць нашым навучэнцам сучасныя інавацыйныя формы навучання. БДУ – вядучая ВНУ, і мы павінны адпавядаць выклікам часу. На нашай кафедры ўжо ўкаранёныя эўрыстычныя методыкі навучання па некалькіх дысцыплінах. Вядома, мы будзем працягваць паглыбляць гэтыя інструменты далей. У чым іх асаблівасць? Дзякуючы ім слухач атрымлівае магчымасць выявіць сябе. Важна, каб студэнт, выконваючы эўрыстычныя заданні, змог ацаніць уласныя кампетэнцыі, выбіраючы розныя спосабы дасягнення і формы гэтага адукацыйнага выніку.

ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

# Размеркаванне ў фактах

З пачатку навучальнага года вялася вялікая праца па падрыхтоўцы і правядзенні размеркавання выпускнікоў. Сёлета ўпершыню старшынямі камісій па размеркаванні былі прызначаны дэканы факультэтаў. Камісіі па размеркаванні выпускнікоў БДУ завяршылі сваю працу ў красавіку. Даразмеркаванне выпускнікоў скончылася ў пачатку чэрвеня. Вынікам працы стала стопрацэнтнае размеркаванне выпускнікоў.

Падлягалі размеркаванню

**1862**

выпускнікі першай ступені вышэйшай адукацыі і

**434**

выпускнікі другой ступені вышэйшай адукацыі.

**7**

студэнтаў, якія навучаліся за кошт уласных сродкаў, выявілі жаданне атрымаць першае месца працы.

Першае месца працы атрымалі

**67**

выпускнікоў Юрыдычнага каледжа БДУ.

**444**

выпускнікі атрымалі адукацыю па педагагічных спецыяльнасцях, з іх

**169**

пачнуць сваю працоўную дзейнасць у сістэме адукацыі.

**343**

накіраваны ў Мінск і Мінскую вобласць.

**22**

выпускнікі накіраваны на працу па мэтавым кантракце ў рэгіёны, гэта галоўным чынам філолагі, журналісты і псіхолагі.

**Паводле інфармацыі ўпраўлення кадраў**




У ФОКУСЕ

# Дасягнуць сінергетычнага эфекту

ЦЭНТР КАРПАРАТЫЎНЫХ КАМУНІКАЦЫЙ БДУ

Цэнтр карпаратыўных камунікацый створаны ў БДУ шляхам зліцця медыяцэнтра, тэлецэнтра і лабараторыі эксперыментальных аўдыявізуальных праграм. Начальнік ЦКК **Таццяна Зайкоўская** расказала пра напрамкі працы новай структуры і пра сваё бачанне адзінай інфармацыйнай дзейнасці БДУ.

***– Таццяна Вікенцьеўна, якія задачы перад ЦКК паставіла кіраўніцтва ўніверсітэта?***

– Галоўная наша задача – умацаванне пазітыўнага іміджу БДУ як вядучага адукацыйнага, навуковага і інавацыйнага цэнтра краіны. Для яе выканання неабходна адзіная інфармацыйна-камунікацыйная палітыка ўніверсітэта, у распрацоўцы якой, а таксама рэалізацыі і аналітыцы, мы ўдзельнічаем. У першую чаргу мы будзем садзейнічаць каардынаванню дзейнасці ўсіх падраздзяленняў БДУ па прадстаўленні ўніверсітэта ў сетцы Інтэрнэт (сайты, сацыяльныя сеткі і інш.).

Акрамя таго мы будзем займацца комплексным прасоўваннем адукацыйных паслуг БДУ на нацыянальны і міжнародны рынкі; развіццём сістэмы апяратыўнага інфармавання ўніверсітэцкай супольнасці па розных напрамках; стварэннем відэакантэнту для падтрымкі сістэмы змяшанага навучання і дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій БДУ.

***– У структуры ЦКК створаны аддзел маркетынгу. Ці мае патрэбу ў рэкламе наш універсітэт?***


Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

– Усебаковае комплекснае прасоўванне адукацыйных паслуг і прадуктаў БДУ – адна з найважнейшых задач. Эфектыўныя і унікальныя маркетынгавыя рашэнні важныя сёння нават для вядомых брэндаў, да ліку якіх належыць БДУ. Лічбавае асяроддзе сучаснага маркетынгу дазваляе шматгранна, цікава і ярка інфармаваць пра дасягненні і распрацоўкі, вядомых навукоўцаў і адораных студэнтах БДУ. Рэкламаваць адукацыйныя паслугі і прадукты ўніверсітэта трэба, выкарыстоўваючы сучасныя мультымедыйныя сродкі – разнастайны аўдыя- і відэакантэнт, графічныя элементы (выявы, фатаграфіі, інфаграфіка), інтэрактыўны кантэнт і нават фарматы віртуальнай і дапоўненай рэальнасці.

***– У ЦКК былі аб'яднаны некалькі аўтаномных структур. Як яны будуць узаемадзейнічаць?***

– Упэўнена, што гэта дасць сінергетычны эфект для прасоўвання БДУ і павялічыць выніковасць дзейнасці падраздзяленняў за кошт інтэграцыі. Аддзел унутрыўніверсітэцкіх камунікацый займаецца мадэраваннем пэўных сегментаў сайта БДУ, напаўненнем лічбавага фотаархіва, а таксама выпускам карпаратыўнай газеты. Напрыклад, газета «Універсітэт» функцыянуе не толькі ў традыцыйным варыянце, але і ў выглядзе паўнавартаснага сайта з мадыфікаванымі публікацыямі, якія распаўсюджваюцца ў сацыяльных сетках. Акрамя таго, мультымедыйныя матэрыялы газеты можна «пабачыць» з дапамогай мабільнага прыкладання HP-Reveal.

А стварэнне відэаролікаў – гэта функцыі праекта «Студэнцкае тэлебачанне» і аддзела па вытворчасці відэакантэнту. Дадзены аддзел арганізаваны на базе тэлецэнтра БДУ для стварэння розных відаў відэакантэнту (адукацыйнага, іміджавага, прэзентацыйнага, рэкламнага і інш.), арганізацыі анлайн-трансляцый мерапрыемстваў БДУ на тэхналагічных пляцоўках цэнтра, арганізацыі відэаздымак значных падзей. Ва ўніверсітэце развіваюцца тэхналогіі электроннага, у тым ліку дыстанцыйнага, навучання – для візуалізацыі патрэбны адмысловы навучальны відэакантэнт.

***– Якія перспектывы ў студэнцкага тэлебачання БДУ, якое базіравалася на факультэце журналістыкі?***

– Праект чакаюць якасныя змены – спадзяюся, што рэпартажы стануць больш разнастайнымі і па фармаце, і па напаўненні. Сёння нават вядомыя тэлекампаніі і СМІ выкарыстоўваюць найноўшыя метады вяшчання і рэсурсы інфармавання: стрым-журналістыку, прамыя трансляцыі, трансляцыі ў сацыяльных сетках, відэаблогерства. Чаму нашым крэатыўным і мабільным студэнтам не паспрабаваць сілы ў такіх фарматах?

***– Як Вы бачыце прасоўванне брэнда БДУ ў нацыянальным і міжнародным маштабе?***

– Сваю першую і другую прафесійную адукацыю я атрымала ў БДУ. Мая дачка таксама пажадала вучыцца ва ўніверсітэце. Я лічу, што тут працуюць выдатныя людзі, многія з якіх не проста калегі, а сябры. У БДУ адмысловы калектыў і атмасфера супрацоўніцтва і самарэалізацыі – гэта праўда. Таму я як кіраўнік цэнтра карпаратыўных камунікацый буду імкнуцца, каб тут вучыліся найлепшыя студэнты з розных краін, каб пра навукоўцаў БДУ і распрацоўкі ўніверсітэта ведалі ў Беларусі і за мяжой. Прэзентаваць БДУ трэба ярка, мабільна, інавацыйна, таму што БДУ – найлепшы ўніверсітэт краіны, гэта наш нацыянальны брэнд і наш гонар.

**Гутарыў Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

**Даведка**

**ЗАЙКОЎСКАЯ Таццяна Вікенцьеўна** скончыла філалагічны факультэт БДУ (1989 г.), ІБМТ па спецыяльнасці «Інавацыйны менеджмент» (2012 г.). У БДУ працуе з 2009 года. На працягу шасці гадоў узначальвала аддзел маркетынгу Інстытута бізнесу.

З'яўляецца адным з распрацоўшчыкаў адукацыйных стандартаў Беларусі і тыпавых навучальных планаў спецыяльнасцяў перападрыхтоўкі «Рэкламны менеджмент» і «Інтэрнэт-маркетынг». Стажыравалася ў ВНУ Францыі і Польшчы.

Кантакты Цэнтра карпаратыўных камунікацый БДУ:
г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, к. 715
+375 17 259 74 09
media.bsu.by

З НАГОДЫ

# Мадэляванне лічбавага свету

## Кафедры матэматычнага мадэлявання і аналізу дадзеных ФПМІ – 30 гадоў

### Гісторыя стварэння

Кафедра ММАД створана на ФПМІ 8 чэрвеня 1988 г. Яна стала весці падрыхтоўку спецыялістаў у галіне матэматычнага мадэлявання складаных сістэм, матэматычнага і праграмнага забеспячэння аўтаматызаванай апрацоўкі дадзеных.

Арганізатарам і першым загадчыкам кафедры стаў доктар фіз.-мат. навук прафесар Ю. С. Харын.

У верасні 1988 г. пры кафедры была створана НДЛ статыстычнага аналізу і мадэлявання на чале з кандыдатам тэхнічных навук М. Д. Сцяпанавай.

### Адукацыйны працэс

Кафедра ММАД выступіла арганізатарам шэрагу новых для краіны спецыяльнасцяў для I ступені вышэйшай адукацыі:

«Эканамічная кібернетыка» (створана ў 1991 г.) сумесна з кафедрай метадаў аптымальнага кіравання;

«Камп'ютарная бяспека» (2002 г.) сумесна з кафедрай тэхналогій праграмавання;

«Прыкладная крыптаграфія» (2012 г.) сумесна з ваенным факультэтам.

Для II ступені вышэйшай адукацыі распрацаваны новыя 1-гадовыя і 2-гадовыя магістарскія навучальныя праграмы:

«Матэматычнае і праграмнае забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі» сумесна з кафедрай тэхналогій праграмавання (2010 г.);

«Прыкладны камп'ютарны аналіз дадзеных» сумесна з кафедрай тэорыі верагоднасцяў і матэматычнай статыстыкі па міжнароднай праграме ЕС TEMPUS (2017 г.).

Для новай у РБ аспірантуры ў 1998 г. па спецыяльнасці «метады і сістэмы абароны інфармацыі. Інфармацыйная бяспека» распрацаваны Пашпарт спецыяльнасці і Праграма кандыдацкага мінімуму.

За 30-гадовы перыяд на кафедры ММАД падрыхтавана звыш 800 спецыялістаў, 35 кандыдатаў і 1 доктар навук. Выпускнікі кафедры працуюць у сістэме вышэйшай адукацыі, НАН Беларусі, дзяржаўных арганізацыях і шматлікіх камп'ютарных кампаніях. Многія выпускнікі кафедры паспяхова развіваюць сваю кар'еру за мяжой: у ЗША, Вялікабрытаніі, Канадзе, Германіі, Францыі і інш.

За 30-гадовы перыяд распрацавана больш за 25 курсаў, больш за 50 спецкурсаў, спецсемінараў, спецлабараторных камп'ютарных практыкумаў.

### Навуковыя дасягненні

Навуковыя даследаванні ў 1988–1999 гг. праводзіліся сумесна з НДЛ СТАМ, на базе якой 18 жніўня 2000 г. Пастановай Савета Міністраў РБ быў створаны ННДЦ прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі, пераўтвораны ва ўстанову БДУ «НДІ прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі» (НДІ ППМІ). З 2008 г. кафедра ММАД праводзіць даследаванні сумесна з падраздзяленнямі НДІ ППМІ: НДЛ статыстычнага аналізу і мадэлявання, НДЛ матэматычных метадаў абароны інфармацыі, НДЛ праблем бяспекі інфармацыйных тэхналогій, НДЛ прыкладной інфарматыкі, навукова-даследчым сектарам камп'ютарнага аналізу дадзеных.

У рамках навуковага напрамку «Прыкладная матэматыка і інфарматыка» створана навуковая школа «Матэматычнае мадэляванне складаных сістэм, працэсаў абароны інфармацыі і камп'ютарнага аналізу дадзеных» (заснавальнік і кіраўнік – член-карэспандэнт НАН Беларусі Ю. С. Харын, заслужаны дзеяч навукі, лаўрэат Дзяржпрэміі РБ).

Асноўныя навуковыя напрамкі фундаментальных даследаванняў:

Матэматычная і прыкладная статыстыка;

Матэматычнае і камп'ютарнае мадэляванне складаных сістэм і працэсаў;

Статыстычны аналіз дадзеных складанай структуры;

Камп'ютарны аналіз дадзеных (Data Mining, шматмерны аналіз, дыскрымінантны аналіз, кластарны аналіз, інтэлектуальны аналіз дадзеных, аналіз часавых шэрагаў, прагназаванне);

Абарона інфармацыі;

Эканаметрыка і матэматычная эканоміка.

Найбольш каштоўныя для практыкі дасягненні прыкладных даследаванняў:

Распрацаваны метады, алгарытмы і праграмнае забеспячэнне для прасторава-часавага кластарнага аналізу пры вызначэнні геаграфічнага размеркавання рэдкіх хвароб;

Распрацаваны сістэмы эканаметрычных мадэляў СЭМ-ДКП-1, СЭМ-ДКП-2, прызначаныя для аналізу, прагназавання і ацэнкі варыянтаў грашова-крэдытнай палітыкі;

Распрацавана сістэма апераджальных індыкатараў і праграмнае забеспячэнне для аналізу эканаметрычных цыклаў беларускай эканомікі.

За 30-гадовы перыяд апублікавана звыш 900 навуковых прац, у тым ліку 9 манаграфій (з іх 4 за мяжой), звыш 25 падручнікаў і навучальных дапаможнікаў, 4 спецвыпускі навуковага часопіса Austrian Journal of Statistics.

Ужо на другі год існавання кафедры (1989 г.) створана СНДЛ «Камп'ютарны аналіз дадзеных і мадэляванне» (кіраўнікі: дац. У. І. Малюгін, член-кар. Ю. С. Харын), якая з 1996 г. штогод з'яўляецца прызёрам конкурсу БДУ, а ў 2006, 2010 і 2014 гг. прэміявалася спецфондам Прэзідэнта РБ. СНГ «Камп'ютарнае мадэляванне ў эканоміцы» з'яўляецца пераможцам першага конкурсу БДУ на найлепшы студэнцкі гурток (2016 г.). Для студэнтаў 1–2 курсаў працуюць навуковыя гурткі: «Камп'ютарнае мадэляванне ў эканоміцы», «Статыстычнае мадэляванне і аналіз дадзеных», «Камп'ютарная бяспека».

### Міжнароднае супрацоўніцтва

Кафедра ММАД бярэ ўдзел у еўрапейскіх даследаваннях і акадэмічных праектах, фінансаваных праграмамі INTAS, TEMPUS, REAP, ERASMUS; выконвае міжнародныя кантракты з камп'ютарнымі фірмамі з Паўднёвай Карэі і Расіі; арганізавала 11 міжнародных навуковых канферэнцый «Камп'ютарны аналіз дадзеных і мадэляванне: тэарэтычная і прыкладная стахастыка» (у канферэнцыі 2016 г. прынялі ўдзел больш за 150 навукоўцаў з 22 краін); выконвае працоўныя праграмы па матэматыцы і інфарматыцы ў рамках супрацоўніцтва БДУ з Венскім універсітэтам тэхналогій (Аўстрыя), Вільнюскім універсітэтам (Літва), Сафійскім універсітэтам (Балгарыя), Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам імя М. В. Ламаносава (Расія).

### Перспектывы

Навуковыя і адукацыйныя напрамкі кафедры – матэматычнае мадэляванне складаных сістэм і аналіз дадзеных – настолькі ўдала спрагназаваныя, што іх актуальнасць у наш час не толькі захавалася, але і шматразова ўзрасла. Справа ў тым, што станаўленне глабальнай інфармацыйнай прасторы, часам званай Лічбавым светам, нацыянальных інфармацыйных прастор, карпаратыўных інфармацыйных прастор носіць незваротны характар. Лічбавы свет спараджае новыя катэгорыі: лічбавая эканоміка, электронны ўрад, электронны гандаль, крыптавалюта, тэхналогія блокчэйн і інш. Галоўным высокакаштоўным рэсурсам, або таварам, у Лічбавым свеце з'яўляецца Інфармацыя, якую даводзіцца ствараць (спараджаць), захоўваць, апрацоўваць і абараняць. Аб'ёмы інфармацыі, якая цыркулюе ў Лічбавым свеце, растуць экспанентна хутка, і да 2020 года чакаецца назапашванне каля $10^{25}$ байт інфармацыі (для параўнання, у аглядным Сусвеце ўсяго каля $10^{25}$ зорак). Лічбавы свет высунуў перад матэматыкай і інфарматыкай дзве глабальныя навуковыя праблемы:

1) распрацаваць мадэлі і праграмныя сродкі аналізу велізарных масіваў дадзеных (big data) рознай прыроды з мэтай выяўлення заканамернасцяў, пабудовы аптымальных рашэнняў, прагнозаў для эфектыўнага развіцця чалавечага грамадства;

2) распрацаваць мадэлі і апаратна-праграмныя сродкі абароны інфармацыі ад яе ўцечкі і несанкцыянаваных уздзеянняў.

Менавіта для рашэння гэтых ключавых праблем развіцця сучаснага грамадства і рыхтуе кафедра спецыялістаў, а таксама скіраваны ўсе НДР.

**Павел МАНДРЫК, дэкан ФПМІ,**
**Юрый ХАРЫН, дырэктар НДІ ППМІ**

АСОБЫ

# Уся беларуская сацыялогія

## 5 ліпеня патрыярху беларускай сацыялогіі **Георгію Давідзюку** спаўняецца 95 гадоў!



Зайздросны лёс гэтага выдатнага чалавека: воіна, працаўніка, настаўніка. Як шмат сёння людзей, якія хочуць шчыра, ад усёй душы, сказаць Георгію Пятровічу простае чалавечае «дзякуй», захапляючыся яго жыццёвым подзвігам, падзвіжніцтвам, чалавечай спагадлівасцю. Пажадаць яму здароўя і даўгалецця. Нягледзячы на жыццёвыя нягоды, цяжкасці і нястачы ваеннага ліхалецця, беды і трагедыі, зменлівасці лёсу, Георгій Пятровіч ніколі не страчвае прысутнасці духу, заўсёды ў працы і клопатах, імкнецца жыць з радасцю, зараджае аптымізмам. І гэта спрацоўвае... ён і сёння ў парадку!

У сярэдзіне мінулага года ўніверсітэцкія сацыёлагі ўрачыста адсвяткавалі паўвекавы юбілей Праблемнай навукова-даследчай лабараторыі сацыялагічных даследаванняў (ПНДЛСД) – дарэчы, першага навуковага падраздзялення сацыялагічнага профілю ў Беларусі. Георгій Пятровіч выступіў з пажаданнем, успомніў пра сумесную працу, а пасля заканчэння, калі ўдзельнікі форуму атачылі яго з пытаннямі, ён яшчэ доўга гутарыў з імі пра справы надзённыя. Бо ўсе памятаюць, што, калі ён узначальваў ПНДЛСД, лабараторыя стала сапраўдy кузняй кадраў прафесійных сацыёлагаў.

Выступаючы перад сваімі вучнямі, студэнтамі сацыялагічнага аддзялення роднага БДУ, Георгій Пятровіч прамаўляў, як заўсёды, горача, пераканаўча, выразна фармулюючы сваю думку... Не, узрост тут ні прычым... калі чалавек верыць!

Георгій Пятровіч паставіў на крыло першае пакаленне прафесійных сацыёлагаў у Беларусі, шмат зрабіў для сцвярджэння сацыялогіі ў Акадэміі навук, БДУ, вышэйшай школе, прамысловых прадпрыемствах краіны. Пры гэтым, не шкадуючы сіл, рыхтаваў прафесійныя кадры для навукі і адукацыі, пераадольваючы ўсе перашкоды на сваім шляху. Ён аўтар першых падручнікаў па новай для таго часу навуцы – сацыялогіі, пад яго рэдакцыяй выйшаў першы ў Саюзе «Слоўнік прыкладной сацыялогіі», ён заснаваў беларускую сацыялагічную школу.

З маленства на ўласным досведзе Давідзюк спазнаў цяжкую сялянскую працу, у школу хадзіў, калі дазваляла праца. Да вайны скончыў шэсць класаў польскай агульнаадукацыйнай школы. У няпоўныя дваццаць гадоў – камандзір роты партызанскага атрада. Ваяваў адважна, быў тройчы паранены. Пасля вайны адначасова працаваў і вучыўся: скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя М. Горкага, працаваў у партыйных структурах Брэсцкай вобласці, ЦК КПБ, скончыў Акадэмію грамадскіх навук у Маскве, абараніў кандыдацкую дысертацыю, працаваў у Інстытуце філасофіі і права АН БССР. У 1969 г. Г. П. Давідзюк паспяхова абараняе доктарскую дысертацыю па філасофскіх навуках, з 1970 г. – прафесар. Сталым чалавекам, які нямала пабачыў на сваім жыццёвым шляху, прыйшоў у 1972 г. Г. П. Давідзюк у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт па запрашэнні рэктара У. М. Сікорскага на кіраўніцтва кафедрай філасофіі гуманітарных факультэтаў.

Георгій Пятровіч патрапіў у першы прызыў сацыёлагаў. Сацыялагічнай навуцы ён прысвяціў сябе цалкам і без астачы. Як і ў гады вайны, малады партызанскі камандзір ішоў у бой з адкрытым забралам, атрымліваючы ўдары з усіх бакоў, разнастайныя непрыемнасці, папрокі калегаў і неразуменне сяброў. Пры гэтым ён ніколі сябе не шкадаваў, нікому не скардзіўся на цяжкасці і неразуменне, проста рабіў што мог... аддаваў людзям веды, увесь свой вольны час.

Ён у адным шэрагу з нашымі класікамі – А. Р. Здравамыславым, Ю. А. Лявадам, Г. В. Осіпавым, У. А. Ядавым, Б. А. Грушыным, У. М. Шубкіным, А. Г. Харчавым, іншымі першапраходцамі. Як педагог і кіраўнік Георгій Пятровіч заўсёды знаходзіў падыход да людзей, аб'ядноўваў іх новымі ідэямі і запальваў на рэалізацыю навуковых праектаў.

Вядома, Г. П. Давідзюк мог і строга спытаць, і пытаў спаўна, калі гэтага патрабавалі абставіны, інтарэсы справы. І яшчэ: нельга не сказаць пра такую выдатную рысу яго характару, што цяжка было чакаць ад такога суровага па жыцці чалавека, як выключна асцярожнае стаўленне да людзей, іх здаровых амбіцый і запатрабаванняў. Таму дагэтуль абавязкова з вялікай павагай, заўсёды добрым словам успамінаюць пра сумесную працу са сваім настаўнікам яго вучні, якія сталі дарослымі і даўно пасталелі. Іх шмат, а калі лічыць з вучнямі вучняў, то гэта і ёсць практычна ўся беларуская сацыялогія.

Сёння мы ўспамінаем добрым словам і жонку Георгія Пятровіча, яго адданую спадарожніцу жыцця Клаўдзію Сцяпанаўну. Яны створаны адзін для аднаго, ужо больш за 70 гадоў неразлучныя і ў радасці, і ў горы.

Здароўя Вам, дарагі Георгій Пятровіч! І да гэтага пажадання далучаюцца ўсе Вашы шматлікія вучні, уся наша вялікая сацыялагічная сям'я!

**Аляксандр ДАНІЛАЎ,**
**загадчык кафедры сацыялогіі,**
**член-карэспандэнт**
**НАН Беларусі**





Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

# Галоўнае – пачаць...

## Рэктарскі баль выпускнікоў прайшоў у БДУ

Святочнае мерапрыемства сабрала 600 найлепшых учорашніх студэнтаў БДУ. У іх ліку пераможцы розных навуковых алімпіяд, удзельнікі міжнародных канферэнцый, выдатнікі вучобы, а таксама тыя, хто дасягнуў высокіх вынікаў у грамадскай, культурнай і спартыўнай дзейнасці.

Рэктар БДУ **Андрэй Кароль** у прамове адзначыў асаблівасць выпускніка вядучай ВНУ краіны, указаўшы на крэатыўнасць, унікальнасць і любоў да альма-матар кожнага студэнта. Рэктар пажадаў героям свята быць паспяховымі ў сваім жыццёвым універсітэце дзякуючы развітаму патэнцыялу і імкненню да самазмянення.

Цырымонія працягнулася ўшанаваннем уладальнікаў тытула **«Найлепшы выпускнік БДУ»**. Дыпломы і памятныя сувеніры атрымаў 21 выпускнік, сярод якіх: Карына Шапавалава (эканамічны факультэт), Ілья Пратасеня (юрыдычны факультэт), Юлія Людчык (ФРКТ), Лізавета Лысенка (ФФСН), Кацярына Вараб’ёва (ФСК), Вольга Тугай (хімічны факультэт), Таццяна Качаткова (фізічны факультэт), Ганна Садоўская (філалагічны факультэт), Карына Ярмашук (ФМА), Карына Мятко (гістарычны факультэт), Андрэй Ільін (ФПМІ), Мікалай Гулецкі (ММФ), Вольга Пірог (факультэт журналістыкі), Дана Сіроткіна (біялагічны факультэт), Пётр Стрэж (ваенны факультэт), Людміла Віленчыц (геаграфічны факультэт), Юлія Грыбовіч (юрыдычны каледж), Апалінарыя Станкевіч (Інстытут тэалогіі імя св. Мяфодзія і Кірыла), Марыя Ясайтэ (МДЭІ імя А. Д. Сахарава), Наталля Барташ (Інстытут бізнесу), Крысціна Шыпількевіч (ДІКСТ).

Ад імя ўзнагароджаных прагучалі ў адрас кіраўніцтва і выкладчыкаў БДУ слова падзякі за набытыя веды і досвед, сяброў, а самае галоўнае – падтрымку і веру на працягу студэнцкіх гадоў.

Па выніках грамадскай, культурнай і спартыўнай дзейнасці былі названы імёны 20 выпускнікоў, якія сталі «зоркай БДУ» і 12 «студэнцкіх лідараў БДУ». У катэгорыі **«Зорка»** адзначаны: Марыя Германовіч (эканамічны факультэт), Дзяніс Бортнікаў (юрыдычны факультэт), Ігар Балыкін (ФРКТ), Алеся Валадзько (ФФСН), Ксенія Ходырава (ФСК), Алёна Клімовіч (хімічны факультэт), Вольга Куракова (ДІКСТ), Анастасія Шылава (філалагічны факультэт), Вячаслаў Коўшык (МДЭІ імя А. Д. Сахарава), Анастасія Канончык (ФМА), Дзяніс Сілянкоў (гістарычны факультэт), Марыя Толкач (Інстытут тэалогіі імя св. Мяфодзія і Кірыла), Ілья Свінцоў (ФПМІ), Вікторыя Сарокіна (ММФ), Анжаліка Пушнова (факультэт журналістыкі), Павел Ходзька (ваенны факультэт), Вікторыя Дубешка (геаграфічны факультэт), Марыя Бабкова (фізічны факультэт), Крысціна Кечко (біялагічны факультэт) і Марыя Літвіновіч (юрыдычны каледж).

**«Студэнцкімі лідарамі»** абвешчаны Канстанцін Андрусевіч (гістарычны факультэт), Кірыл Карабан і Аляксандра Егунёва (факультэт журналістыкі), Караліна Чарнашэй (ФФСН), Яна Паўлоўская і Анастасія Нікіціна (філалагічны факультэт), Вераніка Курдзюк (гістарычны факультэт), Лізавета Каваленка (фізічны факультэт), Кацярына Фянчук (хімічны факультэт), Мацвей Шабалін (эканамічны факультэт), Джавід Гамзатаў і Ігар Бокі (юрыдычны факультэт).

Усяго сёлета дыплом БДУ атрымалі звыш 5440 маладых людзей, з якіх 3400 скончылі дзённае аддзяленне і 2044 – завочнае.

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**











УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 28.06.2018 г.
Зак. 694. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

**Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праспект Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***